**АРХІТЭКТУ́РНАЯ ФО́РМА**, матэрыяльны выраз мастацка-эстэтычнай сутнасці будынка, збудавання; абрысы, контур архіт. аб'ёму. З'яўляецца гал. элементам арганізацыі архіт. асяроддзя. Праз форму архітэктура выражае геаметрычныя характарыстыкі (плоскасць, лінія, прапорцыі), канструкцыйныя ўласцівасці (трываласць, раўнавага, пругкасць), эстэтычныя якасці (колер, фактура). Выбар формы будынка ці збудавання абумоўлены функцыянальнымі патрабаваннямі і прадугледжвае ўлік спецыфікі архіт. асяроддзя, у адпаведнасці з якім вызначаюцца прапарцыянальныя суадносіны элементаў аб'екта, выбіраюцца матэрыялы, здольныя падкрэсліць якасці А.ф. (пластычнасць або поліганальнасць, масіўнасць або тонкасць, брутальнасць або празрыстасць). У пасляваен. перыяд побач з простымі геаметрычнымі формамі 1910—30-х гг. (куб, шар, цыліндр, паралелепіпед) з'явіліся падобныя на спіраль, крывалінейныя, якія выяўлялі экспрэсію. А.ф. зведала ўплыў сімвалізму: новыя праекты адлюстроўвалі асацыятыўныя вобразы — крылы птушкі або лайнера, хвалі акіяна або ветразі. У 1970-я гг. дамінавалі формы элементарнай геаметрыі — прызмы, піраміды, паралелепіпеды, якія выступалі

*Да арт. **Архітэктурная форма**. Адміністрацыйны будынак ААТ «Лукойл» у Мінску.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

элементамі ўпарадкавання урбаністычнага асяроддзя. З пашырэннем новых стылявых тэндэнцый (постмадэрнізму, дэканструктывізму, хайтэку) сцвердзіліся гіст., тэхнакратычныя, арганічныя, абстрактныя А.ф. У сучаснай архітэктуры пашыраны шарападобныя і сферычныя, пірамідальныя, вежавыя, арачныя формы. Атрымалі пашырэнне А.ф. караблёў, самалётаў, дырыжабляў (вучэбны корпус архіт.-буд. факультэта Бел. нац. тэхн. ун-та ў Мінску, 1983). Пры выбары розных сродкаў маст. выразнасці архітэктары імкнуліся да пераймання арганічных форм: прыродных утварэнняў — ільдзін (*Мінскі лядовы палац спорту*), айсбергаў (цэнтр моладзі «Айсберг» у Мінску, 2007), ракавін (праект комплексу адм. будынка, офіснага цэнтра і гасцініцы «Golden City» ў Мінску, 2007), алмазаў (*Нацыянальная бібліятэка Беларусі*) і пладоў — пачаткаў кукурузы (жылыя дамы па вул. В.Харужай у Мінску, 1982) і інш. У наш час А.ф. абвастраюцца, нахіленыя плоскасці здаюцца выпадковымі і выражаюць дысгармонію паміж формай і матэрыяламі, падкрэсліваецца наўмысная нерэгулярнасць. Скажэнне прынцыпаў Эўклідавай геаметрыі сцвярджаецца дэфармацыяй форм конуса, цыліндра, прызмы, дынамізмам, утвораным нахіленымі лініямі, зрушваннямі і наслаеннямі плоскасцей (адм. будынак з комплексам быт. абслугоўвання «Лукойл» у Мінску, 1999—2002).

*Літ.*: Захарына Ю.Ю. Мастацкі вобраз архітэктуры Беларусі апошняй чвэрці XX — пачатку XXI стагоддзя. Мінск, 2008.

*Ю.Ю.Захарына.*

*Да арт.* ***Архітэктурная форма****. Цэнтр моладзі «Айсберг» у Мінску.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ